Ірына Казакова

# ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ ЯК СПЕЦЫФІЧНАЯ БЕЛАРУСКАЯ З'ЯВА Ў СЛАВЯНСКІМ ФАЛЬКЛОРЫ

Восеньскі цыкл земляробчага календара ў беларусаў адрозніваецца ад падобнага цыкла ў іншых народаў больш багатай паэзіяй, што прымусіла даследчыкаў аднесці апошнюю да нацыянальнай спецыфікі беларускага фальклору, таксама як і валачобныя, хрэсьбінныя песні. Гэты цыкл характарызуецца завяршальнымі работамі земляроба на полі, якія адлюстраваліся ў восеньскіх песнях. Але дыяпазон ахопу рэчаіснасці, звязанай з дадзенай парой года, значна шырэйшы: апрача песень ярынных, ільняных і канапляных, якія прымяркоўваліся да ўборкі яравых культур, а таксама да збору ягад, грыбоў, арэхаў, да восеньскага цыкла адносяцца песні, у якіх адлюстроўваецца перадшлюбная і сямейная тэматыка, што абумоўлена павелічэннем у гэты час колькасці вяселляў. Часам да восеньскіх адносяць і пастухоўскія песні, але яны выконваюцца і вясной, і летам.

Ярынныя песні таксама не абмяжоўваюцца адлюстраваннем уборкі яравога жыта, яравой пшаніцы, ячменю, аўса, грэчкі і іншых зерневых культур. Многія з іх прысвячаліся тэме кахання, шлюбу, непазбежнасці расставання дзяўчыны з сям'ёй і невядомасці лёсу сярод «чужынцаў». Магчыма, з-за прадчування блізкай разлукі асабліва прачула выказвае свае пачуцці да маці гераіня песні «На даліне», у якой «тры Кацярыны ячмень жнуць», а дзяўчына звяртаецца да Бога з просьбай «зраўнаваць гару і даліну раўненька» і прынесці яе «мамачку раненька». Глыбокія пачуцці да маці выказваюцца ласкавымі словамі:

Я сваю мамачку
Ай па галасочку
Спазнаю,

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Па галасочку
І па платочку
Спазнаю[1].

Песня «Ой, на гарэ ячмень жала» толькі пачынаецца са жніва ячменю, а ў сваім асноўным змесце раскрывае ўзаемаадносіны дзяўчыны з «бел малойчыкам». «Бел малойчык» пагражае ёй:

…Будуць твае русы косы
Пад маёй нагою.
Будуць твае русы косы
Усе паразвязаны,
Будуць твае дробны слёзы
Усе паразліваны…[2]

Падобна гэтай песні яравая культура толькі называецца ў восеньскай песні «А пшанічка ярыцца, ярыцца», яе ж асноўны змест у жартаўлівай форме адлюстроўвае ўзаемаадносіны паміж дзяўчынай Агаткай і хлопцам Юзэткам. Песня будуецца на антытэзе герояў:

А Юзэтка п'яніца, п'яніца,
Агатка міленька, міленька,
Прытулілася блізенька, блізенька…

Высвятляецца, што і Агатка небездакорная: яна

...прасці не ўмее,
Шыць, мыць – не наўчыць,
А жаць – не прыгнецца, не прыгнецца,
Як увідзець Юзэтку,
Так і прыхінецца…[3]

У многіх варыянтах бытавала песня «Авясец, мамачка. Авясец!», у якой завяршальныя восеньскія работы па часе супадаюць са шлюбнымі настроямі моладзі. Лірычная гераіня пытае ў маці, калі да яе Бог сватоў «прынясець», маці ж адказвае:

– Пажнем, дачушка, авясец,
Тады к табе Бог сватоў прынясець.
Судзі, Божа, каноплі пабраць,
Тады будзем вяселле гуляць[4].

---

[1] Восеньскія і талочныя песні / склад.: А. С. Ліс, С. Т. Асташэвіч, В. І. Ялатаў. Мінск, 1981. С. 68.
[2] Там жа. С. 106–107.
[3] Там жа. С. 91.
[4] Там жа. С. 111–112.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

У іншых песнях дзяўчына або выконвае ўмову маці і зжынае «авясец», выбірае каноплі, а сваты не прыязджаюць, або адмаўляецца жаць «авясец» і збіраецца чакаць сватоў («Дзевяць каля варот аб’едзе, // А восем заедзе»). У некаторых песнях дзяўчына паслухмяна робіць усё, што загадвае маці, і бярэ шлюб, але адразу ж расчароўваецца:

…У чацвер авясец дажала,
У пятніцу канапелькі дабрала,
У суботу сватоў даждала,
У нядзелю вяселле згуляла,
У панядзелак з замужжа ўдрала[1].

У некаторых варыянтах песні замест Бога фігуруе чорт, на якога спадзяюцца, што ён «прынясе» сватоў. Дзяўчына часам звяртаецца не да матулькі, а да таткі, які таксама абнадзейвае дачку, што ўвосень сваты «будуць ездзіць па восем», але калі яны «сыплюць золата», «Татка золата не бярэць, // Мяне, маладу, не аддаець», – у роспачы гаворыць гераіня песні.

Распаўсюджаны быў матыў выбару дзяўчыны хлопцам. Народная песня мудра раіць хлопцу выбіраць дзяўчыну не «на рынку», а на ніўцы ў час жніва ярыны:

Да на рынку дзевачкі хваслівы,
А на ніўкі дзевачкі праўдзівы,
У каторай постаць шырэй,
У каторай снапоў часцей,
У каторай галоўка гладзей,
У каторай кашулька бялей[2].

У некаторых песнях прыгожа ўвасабляецца восень, яна паўстае ў персаніфікаваным вобразе, па-чалавечы размаўляе:

– Ой, восень, мая восень,
Восень сцюдзёная,
Чаго рана ты захаладала?
– Я й не раненька,
Я й не позненька,
Калі мая пара прыйшла,
Лісточак апаў, зямельку ўслаў –
Вот мая пара і прыйшла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі –
Вот мая й другая пара[3].

---

[1] Восеньскія і талочныя песні. С. 114.
[2] Там жа.
[3] Там жа. С. 154–155.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Важную эстэтычную ролю ў восеньскіх песнях адыгрывае прырода, паэтычныя малюнкі якой перадаюць эмацыянальна-псіхалагічны стан персанажаў, іх унутраны свет, душэўныя перажыванні ў адказны час, калі вырашаўся лёс дзяўчыны, хлопца, – час іх шлюбу. Асабліва гэта датычыцца песень, кампазіцыя якіх грунтуецца на псіхалагічным паралелізме. Даследчык восеньскіх песень А. С. Ліс слушна адзначыў асаблівасці паэтызацыі прыроды ў іх: «Развітальны покліч журавоў, пачуты жнеямі з яравой пожні, неспакойнае рыканне мядзведзя ў пошуку прыстанішча на зімоўку. Кляновы ліставей, ягадна-зорны пажар каліны пад ветрам, залатая даспелая макаўка на градзе – жывая прыкмета восені, яе вобразы-знакі, што ляглі ў паэтычную тканіну восеньскіх песень, вызначаюць іх вобразны каларыт, танальнасць. Па сутнасці, у каляндарнай лірыцы восені ідзе паэтызацыя прыроды, эстэтызацыя яе, якія не з’яўляюцца самамэтай, а падпарадкаваны галоўнай задачы творцаў традыцыйнай культуры – паўней раскрыць духоўны свет чалавека, змадэліраваць ідэал, які б успрымаўся праз эмоцыі, перажыванні і быў узорам для дзеяння»[1].

Лірычнай эмацыянальнасцю прасякнуты льняныя песні, у якіх адлюстроўваецца нялёгкая праца – бранне льну. Для маладой дзяўчыны ў розных песнях браць лён са свёкрам, свякрухай, дзеверам, ятроўкай, залвіцай – «не бранне – гараванне». Толькі з мілым гэты занятак для яе «не рванне – мілаванне». Лён для сялян быў важнейшай культурай: з яго рабілі тканіну і для адзення, і для абрусаў, і для пасцелі. Таму ён хараша ўвасабляўся ў адухоўлены вобраз:

Бедаваў зялёны лён:
– Ай, бяда мая, бяда,
Што дробныя дарожанькі,
Што буйныя ветрыкі
Не даюць вырасці,
Ні цвяточкам выцвісці!

Гэта першая частка псіхалагічнага паралелізму, якая вобразна адцяняла перажыванні лірычнай гераіні песні, што адлюстраваліся ў другой частцы паралелізму:

– Ай, бяда мая, бяда,
Што частыя госцікі,
Што часценька прыязджаюць,
Моладу намаўляюць,
А матульку спадманываюць,
Не даюць ні вырасці,
Ні касіцы выплесці[2].

[1] Восеньскія і талочныя песні. С. 5.
[2] Там жа. С. 303.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Персаніфікаваны лён у многіх песнях скардзіцца, што яго «з карэнейкам рвуць, не даюць… вырасці, сінім цветам адцвісці», што яго «б’юць і караюць», б’юць «яго галовачкі», «сцелюць… на пожаньцы». Такія вобразы амаль ва ўсіх песнях адыгрывалі важную мастацка-выяўленчую ролю ў раскрыцці духоўнага свету лірычных герояў. Падобна гэтаму персаніфікаваўся вобраз канапелечкі: яна таксама па-чалавечы скардзіцца на ліхія вятры, на іх павевы, у выніку якіх яе абламалі («Ой, гаварыла канапелечка»). У песні «Чом вы, канапелькі, не зялёны стаіце» канапелькі бядуюць, што зверху «клююць вераб’і, // З ісподу канапелькі вада падмыла, // А ў сярэдзіне канапелькі хваля зламіла». І ў гэтай песні дыялог з канапелькамі ўваходзіць у псіхалагічны паралелізм, у другой частцы якога невясёлая дзевачка ў танку заклапочана сваім лёсам: ці браць шлюб, ці ісці ў «чорныя чарнушкі», г. зн. у манастыр.

Песні, якія выконваліся пры збіранні ягад, арэхаў і грыбоў, адначасова з адлюстраваннем збіральніцкай працы раскрываюць пачуцці лірычнай гераіні да яе «міленькага», разважанні аб долі, шлюбе і інш. У многіх песнях паказваюцца паводзіны дзяўчыны пры сустрэчы з казаком у лесе, калі яна заблудзіла, і ў іншых жыццёвых сітуацыях.

Восеньскія песні не так моцна звязаны з абрадамі, як песні іншых каляндарных цыклаў, і маюць іншую функцыянальнасць, у іх адсутнічае магічная функцыя, за выключэннем тых песень, у якіх гучыць праклён або пажаданне. Асноўнымі функцыямі восеньскіх песень з’яўляюцца сугестыўная, дыдактычная, выхаваўчая, эстэтычная. У восеньскіх песнях пераважае элегічны характар.

А. С. Ліс прыйшоў да высновы, што восеньскі цыкл песень уступае толькі веснавому па разнавіднасці песенных груп. Ён слушна адзначыў узмацненне псіхалагізацыі вобраза чалавека, лірызму, што спрыяла наданню цыклу своеасаблівага вобразнага каларыту, мінорнай дамінанты. Мы толькі ўмоўна адносім восеньскія песні да абрадавай паэзіі, бо яны ўваходзяць у земляробчы цыкл з амаль поўнай адсутнасцю сакральных абрадаў у час запісу такіх песень, хоць не выключана, што ў далёкім мінулым гэтыя абрады мелі пэўную вербальную частку.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm